

УКАЗ, ЯКІ ЧАКАЛІ ДАЧНІКІ 2

ЦЯЖАРНАСЦЬ У 35–40 АМАЛОДЖВАЕ 5



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

1 ЧЭРВЕНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 103 (29983)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль МАРКЕВІЧ, міністр культуры:**

*«Сённяшняя моладзь — гэта заўтрашнія кіраўнікі, тыя людзі, што будуць вырашаць шмат пытанняў і праблем, якія ўзнікаюць, якія дыктуе само жыццё. Наша будучыня залежыць ад таго, наколькі мы зможам выхаваць падрастаючае пакаленне і залажыць у яго аснову праз традыцыі, вялікую гісторыю, разуменне сённяшняга дня. Важна прывучыць шанаваць тое, што маем, — цудоўную зямлю, сваю малую радзіму, а таксама выхаваць пачуцці любові, дабрыні і павагі да старэйшых. Тут не можа быць другарадных тэм».*

# Лета. Сонца. Канікулы!



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

**Юныя жыхары вёскі Грабаўка Гомельскага раёна: Аляксандр КАЦАЛАПАЎ, Софія МЕЛЬНІКАВА і Мілена ВАСКУН.**

## КОРАТКА

- Стаўка рэфінансавання знiжана да 9,75 % гадавых.
- **На БелАЭС пачаўся этап даследна-прамысловай эксплуатацыі другога энергаблока.**
- Забароны на наведванне лясоў уведзены ва ўсіх абласцях Беларусі.
- **Энергазабеспячальныя арганізацыі з 1 ліпеня пачнуць работы па абследаванні электрасетак садовых таварыстваў.**
- Музычны фестываль ROCK orchestra FEST адбудзецца ў Мінску 8 чэрвеня.
- **НАН Беларусі аб'явіла конкурс на суісканне прэмій для маладых вучоных.**
- МНС пачне авіяпатруляванне месцаў масавага адпачынку каля вады ў хуткім часе.
- **У Беларусі адпачыла і аздаравілася больш за тры тысячы дзяцей з Данбаса.**

Дзяржаўны інтарэс

## ТЭХНАЛОГІІ, ШТО НАКОРМЯЦЬ

**Чаму пабываць на «Белагра-2023» варта нават тым, хто далёкі ад аграрнай сферы**

**Беларусь — аграрная краіна, і ў нашы дні гэта гучыць горда: у трэцім тысячагоддзі сельская гаспадарка — тая сфера, у якую дзяржавы ўкладваюць сродкі, а найлепшыя галовы — навуковы і даследчы патэнцыял. У сучасным свеце, насельніцтва якога складае каля 8 мільярдаў, харчовая бяспека выходзіць на першы план.**

Канцэпцыя высокатэхналагічнай, або, як прынята казаць, разумнай сельскай гаспадаркі — выкарыстанне камп'ютарных праграм і складанага абсталявання для аптымізацыі працэсаў земляробства, раслінаводства, жывёлагадоўлі, атрымання малака і мяса — укараняецца ў жыццё і ў нашай краіне: гарантаваны ўзровень харчовай бяспекі застаецца адным з асноўных нацыянальных прыярытэтаў Беларусі. Асаблівасці такога падыходу да аграрных работ прафесіяналам будуць цікавыя з практычнага пункту гледжання, а тым, хто не звязаны з аграрнай сферай, — з пункту гледжання пазнавальнага. Тым больш што Міжнародная спецыялізаваная выстава «Белагра» штогод праходзіць не толькі як форум прафесіяналаў, але і як яркае шоу, дзе можна ўбачыць новыя пароды сельскагаспадарчых жывёл, пакаштаваць найноўшыя лініі прадукцыі ад айчынных і замежных вытворцаў і на свае вочы ацаніць інавацыйныя тэхналогіі ў агратэхніцы, раслінаводстве, жывёла- і птушкагадоўлі. А таксама — шырокі спектр магутнай сельгастэхнікі апошняга пакалення. Сёлета ў экспазіцыі выставы — больш за 240 новенькіх бліскучых сельгасмашын, якія выкарыстоўваюць ва ўсіх галінах сельскай гаспадаркі (ад тых, што здзіўляюць сваімі памерамі, да зусім малютак). Наведвальнікам дазволяць пасядзець у іх кабінах — так што на выставу варта прыйсці з дзецьмі.

СТАР. 3

Эх, лета!

## ВАБІЦЬ БЕЛЕНЬКІ ПЯСОЧАК ЛЯ РАКІ...

**На Гомельшчыне паводка ўнесла свае карэктывы ў тэрміны падрыхтоўкі пляжаў да купальнага сезона. На значнай іх частцы вадалазы ўжо даследавалі дно — пляжы ачышчаны ад смецця, занесенага вялікай вадой, і адкрытыя для плавання. Але ёсць зоны адпачынку, дзе ўзровень паводкавых водаў дагэтуль не дазваляе скончыць такую работу.**

СТАР. 13



ISSN 1990 — 763X

23103

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!